Пролетарыі ўсіх краін, аднаўцеся!

ЗАРА

орган Брэсцкага абкома КП(б)Б і аблвыканкома

№ 168 (238) | Серада, 24 ліпеня 1940 г | Цана 10 кап.

У ПРАКУРАТУРЫ СССР

За апошні час органы пракуратуры прыцягнулі да крымінальнай адказнасці рад кіраўнікоў калгасаў за намеранае невыкананне абавязацельстваў па зернапастаўках і антыдзяржаўную практыку ў гэтай справе.

Па віне старшыні калгаса імені Комінтэрна, Варанцова - Александраўскага раёна, Орджанікідзеўскага краю, Касенка з 10 тысяч цэнтнераў зярна новага ўраджаю было здана дзяржаве ў лік зернапаставак толькі 66 цэнтнераў.

У калгасе „Ленінскі шлях", Семікаракорскага раёна, Растоўскай вобласці, па віне старшыні калгаса Мажарава і рахункавода Зеленскага пасля першага абмалоту з 3039 цэнтнераў здана ў лік паставак толькі 30 цэнтнераў, а астатняе зярно ў якасці аванса выдана калгаснікам на працадні.

Касенка, Мажараў і Зеленскі прыцягнуты да крымінальнай адказнасці. Справы іх закончаны следствам і перададзены на разгляд народнага суда.

Старшыня калгаса „Чырвоная Звязда", Будзённаўскага раёна, Орджанікідзеўскага краю, Шчэлкуноў наўмысна запазіў ураджайнасць рада культур, у тым ліку ячменю на 2.584 цэнтнеры. Шчэлкуноў асуджан да 4 гадоў пазбаўлення свабоды.

Старшыня калгаса „Чырвоная Армія" (Орджанікідзеўскі край) Міхайлаў наўмысна запазіў ураджай па ячменю на 5 цэнтнераў, па просу — на 5 цэнтнераў і па аўсу — на 10 цэнтнераў з гектара.

Міхайлаў асуджан да 3 гадоў пазбаўлення свабоды.

(ТАСС).

Да ўсіх рабочых, работніц, інжынераў, тэхнікаў і служачых соцыялістычнай прамысловасці і транспарта

(Зварот гарнякоў шахты Цэнтральная-Ірміна імені Сталіна трэста Серговугаль)

Дарагія таварышы!

Праз паўтара месяца краіна будзе адзначаць слаўную дату — пяцігоддзе ўсенароднага стаханаўскага руху. Гэтыя годы ўвойдуць у гісторыю, як адна з самых слаўных старонак пераможнага шэствія соцыялізма, значных поспехаў асваення багацейшай тэхнікі, роста прадукцыйнасці працы, добрабыту совецкага народа. Нарадзіліся формы стаханаўскага руху, многастаночнае абслугоўванне, сумяшчэнне прафесій, у нас, гарнякоў, акрамя гэтага, патроеная работа ў забоі.

Яркім прыкладам таго, як растуць поспехі соцыялістычнай прамысловасці, з'яўляецца наша шахта. У 1934 годзе мы здабывалі ў суткі 860 тон вугалю, з іх механізмамі толькі 420 тон. Зараз шахта дае 1650 тон, на долю механічнай здабычы прыходзіцца 1400 тон.

Здабыча вугалю расла дзякуючы непрарыўнаму аснашчэнню шахты тэхнікай, усё лепшаму яе выкарыстанню. Ва ўсіх забоях вугаль зараз здабываецца адбойнымі малаткамі. Пяць год назад на шахце было два электравозы — зараз іх 14, такіх машын, як перагружацелі, тады зусім не было, цяпер іх на шахце 8. Намнога павялічылася магутнасць кампрэсарнай электрычнай гаспадаркі. Непрарыўна палепшаліся матэрыяльна-бытавыя ўмовы, рос культурны ўзровень працоўных. У 1934 годзе сярэдні заработак забойшчыка на нашай шахце складаў у месяц 262 рублі, зараз 795 рублёў. Непазнавальным стаў шахтны пасёлак. Ён ператварыўся ў гарняцкі горад Ірміна. У ім пабудаваны 2 школы, 4 вялікіх магазіны, паліклініка і 2 дзіцячых ясляў, радзільны дом, стадыён, дом фізкультуры, пракладзена 8 кіламетраў трамвайнага шляху, звязваючага Ірміна з горадам Серго, пабудаваны піонерскі клуб, радыёвузел, гукавое кіно, многа прыгожых многапавярховых дамоў. Дарогі, тратуары пакрыліся асфальтам. Разбіты паркі, скверы. Збудаван водны басейн. І так не толькі ў нас, але ва ўсіх астатніх шахтах, усіх астатніх прадпрыемствах краіны.

Вырас узровень вытворча-тэхнічных ведаў рабочых. У гэтае пяцігоддзе многія гарнякі сталі тэхнікамі, інжынерамі, многія навучаючыяся ў вучэбным камбінаце шахты атрымалі тэхнічную асвету.

Усе мы перажываем зараз незвычайныя дні вялікага патрыятычнага ўздыму. Услед за Заходняй Украінай і Беларуссю непераможны сцяг большэвізма ўжо назаўсёды зачырванеў над роднымі землямі Бесарабіі і Паўночнай Букавіны. Толькі дзякуючы мудрай і мірнай палітыцы партыі, урада і вялікага Сталіна, несакрушальнай магутнасці нашай роднай Чырвонай Арміі народы Бесарабіі і Паўночнай Букавіны вызваліліся з-пад гнёта румынскіх баяр, капіталістаў і ўвайшлі ў шчаслівую сям'ю народаў СССР. Больш палавіны чалавецтва ўцягнута ў другую імперыялістычную вайну. Народы Совецкага Саюза мірна працуюць пад аховай доблеснай Чырвонай Арміі, якая на Хасане і Халхін-Голе і асабліва на Карэльскім перашэйку паказала сваю вывучку, несакрушальную магутнасць. На ўзрошчую ваенную небяспеку рабочы клас нашай краіны, наша інтэлігенцыя адказалі падоўжаннем рабочага дня і тыдня, каб любімая Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот мелі пабольш танкаў, самалётаў, пабольш гармат, караблёў, каб яшчэ больш моцнай стала наша народная гаспадарка.

Совецкія людзі з найвялікшай радасцю сталі работаць па-новаму, бо яны ведаюць, што толькі сіла можа спыніць капіталістычных драпежнікаў ад спроб утаргнуцца ў наш дом і парушаць нашу мірную працу.

Зараз, як ніколі, мы павінны поўнасцю загрузіць свой рабочы час, каб усе 480 мінут працоўнага дня былі высокапрадукцыйнымі, каб поўнасцю былі выкарыстаны на вытворчасці рэзервы. Дадатковы час работы, пераход на семідзённы рабочы тыдзень даюць магчымасць кожнаму прадпрыемству значна павялічыць выпуск прадукцыі, даць сваёй дзяржаве больш вугалю, метала, нафты, машын і тым самым яшчэ сільней умацаваць гаспадарчую і ваенную магутнасць нашай радзімы.

У нас, у шахце, пераход на 8-гадзінны рабочы дзень дае штосутачны прырост здабычы вугалю ў 211 тон.

Калі таварыш Сталін з трыбуны XVIII з'езда партыі паставіў задачу ў бліжэйшыя 10-15 год перагнаць у эканамічных адносінах самыя перадавыя капіталістычныя краіны Еўропы і Амерыкі, то ўвесь совецкі народ адказаў на гэта шырокім разваротам соцыялістычнага спаборніцтва, даўшы яму імя Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі. Кожны рабочы калектыў, кожны працоўны ў паасобку браў тады на сябе ў гэтым спаборніцтве пачэснае абавязацельства: стаханаўскай працай паскорыць на сусветнай арэне перамогу соцыялістычнай эканомікі над капіталістычнай.

Мы ўступілі тады ў спаборніцтва з калектывам старэйшай у Данбасе Горлаўскай шахты „Качагарка". Свае абавязацельствы мы выканалі з чэсцю. Пасля паспяховай работы ў мінулым годзе намі датэрмінова выкапан поўгадовы план 1940 года. Штосутачна перавыконваюцца вытворчыя заданні зараз.

З пераходам на падоўжаны рабочы дзень і сямідзённы рабочы тыдзень абавязацельствы спаборнічаючых калектываў, усіх спаборнічаючых рабочых, інжынераў, тэхнікаў, служачых устарэлі, сталі нежыццёвымі. Яны ўжо не адпавядаюць новым умовам работы, новым нашым задачам, магчымасцям. Сабе мы абавязаны прад'явіць цяпер больш павышаныя патрабаванні. Усім нам патрэбна пераглядзець свае абавязацельствы ў соцыялістычным спаборніцтве ў бок павышэння. Новы соцыялістычны дагавор павінен адбіваць нашу волю, імкненні даць краіне пабольш прамысловай прадукцыі, каб народная гаспадарка была поўнасцю забяспечана неабходным.

У сябе ў шахце мы ўжо прыступілі да гэтай вялікай справы. Падлік нашых магчымасцей паказаў, што шахта можа да 20 жніўня выканаць васьмімесячную праграму — даць да дня 5 гадавіны стаханаўскага руху 16 тысяч тон вугалю звыш плана. У спаборніцтве з шахтай „Качагарка" мы бралі на сябе абавязацельства выканаць гадавую праграму да 12 снежня, зараз уносім істотную папраўку: гадавы план абавязуемся закончыць да 20 лістапада.

Давайце-ж, таварышы, адзначым пяцігоддзе ўсенароднага стаханаўскага руху новым ростам прадукцыйнасці працы ў краіне, расшырэннем радоў стаханаўцаў, ударнікаў.

Мы заклікаем усіх працоўных Совецкага Саюза, усіх рабочых, інжынераў, тэхнікаў, служачых, асабліва вугальшчыкаў, чый доўг краіне ўсё яшчэ вялікі, паследаваць нашаму прыкладу і прыступіць зараз-жа да паўсяменнага масавага перагляду сваіх абавязацельстваў у соцыялістычным спаборніцтве імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі.

Мы мяркуем зрабіць дзень пятай гадавіны стаханаўскага руху днём першай усенароднай праверкі выканання гэтых новых абавязацельстваў шахтамі, заводамі, фабрыкамі, кожным працоўным. Усенародны агляд адзначым дастойнымі вытворчымі дасягненнямі, дадаткова звыш плана здабытымі тысячамі тон вугалю, метала, кокса, тысячамі новых машын, танкаў, самалётаў, гармат.

Дружнай стаханаўскай працай, бязлітаснай барацьбой з дезарганізатарамі вытворчасці зробім нашу радзіму яшчэ больш магутнай у ваенных, гаспадарчых адносінах. Мы ніколькі не сумняваемся ў тым, што наш заклік знойдзе ва ўсіх гарачы дзелавы водгук.

Няхай жыве пабеданосны рабочы клас краіны соцыялізма!

Няхай жыве совецкая інтэлігенцыя!

Няхай жыве вялікая партыя Леніна-Сталіна!

Няхай жыве бацька стаханаўскага руху, наш друг, настаўнік, першы Герой Соцыялістычнай працы СССР родны, любімы таварыш Сталін!

Па даручэнню 2 тысяч гарнякоў шахты Цэнтральнае - Ірміна імені Сталіна трэста Серговугаль: **Стаханаў, Дзюканаў, Канцэдалаў, Ігнатаў**,—сакратар Сергоўскага горпарткома, ордэнаносец **Петроў**, — загадчык шахтай імені Сталіна, ордэнаносец **Ожогаў** — галоўны інжынер, **Байбікаў** — намеснік сакратара партбюро, **Кармаў**—старшыня шахтнага камітэта, ордэнаносец **Ткачэнка** — сакратар комсамольскай арганізацыі, стаханаўцы: **Халадкоў** — крэпільшчык, ордэнаносец **Барысенка** — дваццатнік, ордэнаносец **Шахоў** — начальнік участка, ордэнаносец **Шэўчэнка** — начальнік участка, ордэнаносец **Сінягоўскі, Ершкоў, Окаракоў, Махумедзян, Ляшэнко, Юшчэнка, Майсеў, Панамарэнка, Бурмістрава, Анісімава, Папова.**

НА ЖНІВЕ

Яшчэ з вечара жнеяры калгаса імені Сталіна Владыслаў Томчак і Якім Струк аглядзелі і старанна змазалі жняркі. Назаўтра, з усходам сонца, яны былі на нагах, каля сваіх машын. Пераканаўшыся яшчэ раз у спраўнасці машын, выехалі ў поле.

Выспеўшае жыта, пасеянае былымі батракамі ўжо без пана Бабінскага, стаіць густой сцяной. Важкія каласы, налітыя буйным зярном, нізка схіляюцца да зямлі. Калгаснікі старанна падрыхтавалі ўчасткі для машыннай уборкі: акуратна зроблена абжынка вуглоў.

...У ранішняй цішыні застракталі жняркі. Круг за кругам агібаюць яны 10-гектарны ўчастак ураджайнага жыта. Услед за жняркамі калгаснікі вяжуць збожжа ў снапы.

На вачох мяняецца выгляд калгаснага поля. Там, дзе яшчэ раніцой хвалявалася ад лёгкага подыху ветра густое жыта, к поўдню вырастаюць бабкі акуратна звязанага ў снапы збожжа. К вечару ўвесь участак на плошчы 10 гектараў зжат. На кожнага жнэяра прыпадае па 5 гектараў. Рэзультатамі работы задаволены калгаснікі.

— Такой выпрацоўкі ніхто не даваў у фальварку, — з радасцю гаворыць Владыслаў Томчак.

— Хіба тады стараліся працаваць,—адклікаецца маладая загарэлая дзяўчына Насця Прашчуровіч.—Працавалі-ж на паноў, а зараз убіраем свой, калгасны ўраджай...

Калі ліпеньскае сонца пачынае хавацца дзесьці за лесам, калгаснікі гурбой вяртаюцца з поля. Бадзёрыя, не адчуваючы стомленасці, яны з песнямі ідуць на калгасную сядзібу. Замест ранейшых нудных песень, у якіх апявалася гора і журба працоўнага селяніна, гучыць бадзёрая, радасная песня аб шчаслівым і вольным жыцці, аб жыцці без прыгнятальнікаў.

* * *

За пяць дзён калгаснікі закончылі жніво жыта на плошчы 48 гектараў. Зараз разгарнулася звозка збожжа з поля. Добра высушанае збожжа складаецца ў скірды. З раніцы да вечара на полі снуюць падводы. Нагружаныя снапамі, яны адна за адной пад'язджаюць да скірд.

Акуратна, па-гаспадароку складаюць калгаснікі снапы ў скірды. Робіцца ўсё, каб не дапусціць страт ураджаю. На ўчастках, з якіх звозіцца збожжа, арганізавана зграбанне калосся. З прэзрэннем і нянавісцю адносяцца чэсныя калгаснікі да тых, хто імкнецца лодарнічаць, рабіць прагулы і зрываць работу. А такія людзі, — праўда іх мала,—ёсць...

Час набліжаўся да вечара. У паветры стаяла гарачыня. На гарызонце збіралася цёмная хмара. Відаць было па ўсяму, што ноччу будзе дождж. Калгаснікі, занятыя па звозцы і окладанні ў скірды збожжа спяшаліся, каб хутчэй завяршыць і накрыць скірду. У гэты самы час калгаснік Сяргей Прашчуровіч кінуў работу і заявіў.

— Хопіць! Пара канчаць работу...

— Як так канчаць,—здзівіўся старык-калгаснік Філіп Марчук.— Хіба не бачыш — дождж будзе. Не закончым скірду, замочыць дождж, пагніе збожжа. А гэта-ж наша ўласнае, а не чыё-небудзь багацце..

Усе калгаснікі з агідай глядзелі на Сяргея Прашчуровіча. Вечарам факт гэты стаў вядом праўлення калгаса. Але ўчынак Сяргея Прашчуровіча не абмеркаван на пасяджэнні праўлення калгаса і на агульным сходзе. На гэтым факце калгаснікаў не мабілізавалі на рашучую барацьбу з дэзарганізатарамі калгаснай вытворчасці.

* * *

Праўленне калгаса пясмела бярэцца вырашаць пытанні калгаснага жыцця. Былыя бяспраўныя батракі, прышоўшыя да кіраўніцтва калгаснай гаспадаркай, адчуваюць патрэбу ў дзелавой і канкрэтнай дапамозе раённых арганізацый. А трэба сказаць, што такой дапамогі яны не атрымоўваюць.

Калгаснікі, ды нават і сам старшыня калгаса, не ведаюць аб тым, што ў першыя 15 — 20 дзён работы на ўборцы калгаснікам, якія выконваюць і перавыконваюць нормы выпрацовак, трэба налічваць працадні ў двайным размеры.

— Налічэнне працадзён у двайным размеры за выкананне і перавыкананне норм—каштоўнае мерапрыемства, — гаворыць старшыня калгаса Оленюк. — Калі-б мы так рабілі, работа ў нас ішла-б яшчэ дружней. Але аб гэтым мы не ведалі. Нам пра гэта ніхто не гаварыў.

Наогул у налічэнні працадзён тут існуе ўраўнілаўка. Жанчыне, напрыклад, якая выконвае норму па звязцы снапоў, налічваюць 1,75 працадня. Столькі-ж налічваюць і жнэяру за выкананне нормы. Між тым не цяжка зразумець, што праца жнэяра больш складаная і намнога цяжэйшая, а значыць яна даражэй і павінна аплачвацца.

У калгасе рыхтуюцца да малацьбы. Устаноўлена малатарня. Але машына-трактарная станцыя марудзіць з прысылкай трактара. Калгаснікі заяўляюць, што свае абавязацельствы перад дзяржавай па хлебапастаўках яны з любоўю выканаюць у першую чаргу, з першых-жа абмалотаў. А колькі калгас павінен будзе здаць зярна дзяржаве, ніхто нават з кіраўнікоў калгаса, не гаворачы ўжо аб калгасніках, дакладна не ведае.

Сакратар райкома партыі тав. Кароткін і старшыня райвыканкома тав. Давыдаў з'яўляюцца частымі гасцямі ў калгасе. Але яны глыбока не ўнікаюць у калгаснае жыццё. Прыедуць, паглядзяць, як ідзе работа, пацікавяцца колькі ўжо ўбрана і на гэтым лічаць сваю місію закончанай. Ад такіх гастралёрскіх візітаў маладому калгасу і яго маладым, яшчэ мала вопытным кіраўнікам, карысці мала.

Ал. Махнач.

Жабінкаўскі раён.

З уступленнем часцей Чырвонай Арміі ў Паўночную Букавіну рабочыя прадпрыемстваў горада Чэрнавіцы стварылі рабочыя камітэты і арганізавалі ахову прадпрыемстваў.

На здымку: маладыя рабочыя трыкатажнай фабрыкі „Геркулес" на пасту каля фабрыкі.

Фота Федасеева. Фота-кліша ТАСС.

Паведамленне Наркамфіна Саюза ССР

Падпіска на Пазыку Трэцяй Пяцігодкі (выпуск трэцяга года) на 20 ліпеня 1940 года дасягнула 9.310.839 тысяч рублёў, гэта значыць перавысіла ўстаноўленую суму пазыкі на 1.310.839 тысяч рублёў.

Далейшая падпіска на Пазыку Трэцяй Пяцігодкі (выпуск трэцяга года) з 21 ліпеня 1940 года паўсяменна спынена.

Узнагароджанне работнікаў чыгуначнага будаўніцтва

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР за паспяховае выкананне заданняў урада па будаўніцтву чыгунак узнагароджаны ордэнамі і медалямі Саюза ССР 668 работнікаў будаўніцтва другіх шляхоў і новых чыгуначных ліній на Далёкім Усходзе, а таксама будаўнікі чыгуначнай лініі Кандалакша — Куолаярві.

Ордэнам Леніна узнагароджаны: Алімаў, Бакін, Барамідзе, Ватманаў, Гільнер, Марыенгоф, Сібірак, Фрэнкель і Фінкенштэйн.

Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцягу ўзнагароджаны 33 чалавекі.

Ордэнам „Знак почета" — 108 чалавек, медаллю „За трудовую доблесть" — 155 чалавек і медаллю „За трудовое отличие" — 361 чалавек.

(ТАСС)

Новая старонка ў гісторыі народаў Літвы, Латвіі і Эстоніі

МАСКВА, 22 ліпеня (ТАСС). Сёння пасля сканчэння работы ва ўсіх цэхах Маскоўскага завода „Дынамо" імені Кірава адбыліся мітынгі, прысвечаныя абгалашэнню совецкай улады ў Латвіі, Літве і Эстоніі.

У аднадушна прынятай рэзалюцыі кіраўцы заяўляюць:

„З найвялікшай радасцю і задавальненнем сустрэлі рабочыя, інжынеры, тэхнікі і служачыя завода дэкларацыі сеймаў Літоўскай і Латвійскай рэспублік і Дзяржаўнай думы Эстоніі аб дзяржаўнай уладзе ў гэтых краінах і ўступленні іх у склад СССР.

Ад гэтага часу ў гісторыі гэтых народаў адкрываецца новая старонка радаснага і шчаслівага жыцця. Ад гэтага часу працоўныя Літвы, Латвіі і Эстоніі назаўсёды вызваляюцца ад капіталістычнага гнёту, эксплаатацыі, насілля, беззаконня і здзекаў рэакцыйнай правячай клікі.

У гэты радасны для ўсіх нас дзень першыя словы прывітання мы шлем вялікаму правадыру працоўных таварышу Сталіну.

Пад кіраўніцтвам слаўнай партыі большэвікоў, пад мудрым вядзіцельствам вялікага Сталіна пераможны поступ'ю будзем ісці" [illegible] „[illegible]".

Новыя гаспадары

На ўкраінах Кішынёва тры чыгуналіцейных заводзікі, мылавараны завод, электрастанцыя, майстэрні абутку і табачная фабрыка. Румынскія акупанты вывозілі з Бесарабіі сыравіну, эксплаатыруючы насельніцтва, і нічога не рабілі для эканамічнага росквіту краю.

Баярскі рэжым разарыў прамысловасць горада, прывёў яе ў стан развала. Амаль ва ўсіх прадпрыемствах абсталяванне запушчана і патрабуе капітальнага рамонту.

Нямала сіл і энергіі прыходзіцца траціць, каб забяспечыць іх бесперабойную работу. Рабочыя камітэты, створаныя на фабрыках і заводах, арганізавалі [illegible] вытворчасцю і ўзялі [illegible] ўпраўленне прадпрыемствамі [illegible]

ля бегства ўладальнікаў у Румынію. Рабочыя табачнай фабрыкі падрыхтавалі да здачы ў эксплаатацыю 6 машын, якія чатыры гады стаялі ў кансервацыі. Да станкоў ставяцца ўноў прынятыя на работу. Да канца года фабрыка павінна даць 200 мільёнаў папярос—у два з лішнім разы больш, чым выпускалася пры румынах. У табачных складах рабочы камітэт абсталяваў сталовую, у штампавачнай майстэрні ўстаноўлена вентыляцыя.

200 сем'яў, туліўшыхся ў вільготных падвалах, пераводзяцца ў прасторныя дамы багацеяў. Паўсюды ўведзен васьмігадзінны рабочы дзень. На ўсіх прадпрыемствах рабочыя арганізавалі [illegible] работ[illegible]

СТАХАНАЎЦЫ ЖНІВА

Жабінка. Разгортваючы соцыялістычнае спаборніцтва, калгаснікі сельгасарцелі імені Молатава дабіліся высокай прадукцыйнасці працы на ўборачных работах. Былы батрак Іван Дзімітрук замест нормы 4 гектары жынае за дзень па 5 гектараў жыта.

Звяно калгаснік, якое працуе на звязцы снапоў, у некалькі разоў перавыконвае нормы выпрацоўкі. Звеньевая Стася Пілярская і калгаснікі Маруся Качмары, Клаўдзія Пятроўская, Соня Врублеўская, Маня Раўдзюк і Анна Вуяк, звязваюць за дзень па 800 снапоў кожная.

Сухавераў,
намеснік дырэктара машынна-трактарнай станцыі па палітычнай часці.

На-хаду ліквідаваць недахопы

Уборачныя работы ў калгасе імені Сталіна, Шэрашэўскага раёна, у поўным разгары. Калгаснікі і калгаснікі арганізавана выходзяць на работу і па-стаханаўску змагаюцца за хуткае і высакаякаснае правядзенне ўборкі. Калгаснікі О. Клімец і М. Рабчук значна перавыконваюць норму выпрацоўкі, жынаючы кожны дзень па 0,15—0,16 гектара.

Але ёсць і такія калгаснікі, якія часта не выходзяць на работу і дезарганізуюць працоўную дысцыпліну. Калгаснікі Залеўскі, Пента і Венокі ў самы гарачы час уборкі самавольна пасхалі ў Беласток і прабылі там 4 дні.

Праз некалькі дзён калгас павінен пачаць малацьбу. Але памяшканне для ссыпкі намалочанага зярна да гэтага часу не падрыхтавана. Не ўсё зроблена і ў справе аховы ўраджаю. Вартаўнікі не вылучаны, не праведзена пікіх проціпажарных мерапрыемстваў. Начальнік проціпажарнай аховы яшчэ не прыступіў да работы.

Усе гэтыя недахопы праўленне калгаса павінна на хаду і ў бліжэйшыя дні ліквідаваць.

М. Гурэвіч.

У ПОЛІ ПРАЦУЕ СЕМ ЖНЯЯРАК

Паспяхова праводзяць уборку ўраджаю калгаснікі сельгасарцелі імені 17 верасня, Высокаўскага раёна. На жніве працуюць сем жняярак. Услед за кожнай жняяркай 8 жанчын вяжуць збожжа ў снапы, а два мужчыны саставляюць іх у бабкі.

Узоры высокай прадукцыйнасці працы паказваюць калгаснікі Нікіфар Карповіч, Пётр Нікалайчык, Еўстафій Багуцкі і калгаснікі Ольга Петрачук, Ганна Баламуцік, Тацьяна Алексюк, Еўдакія Баран, Елена Карповіч, Елена Багуцкая і Елена Сацюк. Яны намнога перавыконваюць дзённыя нормы выпрацоўкі.

Пры плане 209 гектараў у калгасе ўжо зжата 112 гектараў азімага жыта. У бліжэйшыя дні калгаснікі распачнуць малацьбу і здачу збожжа дзяржаве. Тры малатарні добра адрамантаваны і прыведзены ў баявую гатоўнасць.

М. Тэйтэльбаум.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

Канкрэтна кіраваць работай прадпрыемства

У комуністы партарганізацыі лесазавода „Чырвоная Зорка" (лесапухімсаюз) часта між сабой гаварылі аб наяўнасці вялікіх недахопаў у рабоце. У зімовы час гэты завод палову часу стаяў без работы за адсутнасцю лесаматэрыяла. Праўленне арцелі (старшыня т. Звераў) ніяк не магло наладзіць загатоўкі лесаматэрыялу. Палова членаў арцелі была занята на невытворчых работах.

Завод увесь час у цяжкім фінансавым становішчы. Па балансу на першага студзеня значылася прыбытку 70 тысяч, а на першага чэрвеня ёсць убытак. З чаго ствараўся прыбытак на першага студзеня? Аказваецца, што гэты прыбытак атрымаўся не ў выніку добрай работы завода, а ў сувязі з праведзенай пераацэнкай матэрыяла, які знаходзіўся на складах завода.

Заработная плата выплачваецца членам арцелі нерэгулярна. За другую палову чэрвеня яшчэ не выплачана зарплата членам арцелі на адным цэху, хаця мінула 20 дзён ліпеня. Запазычанасць банку складае 44 тысячы рублёў.

Нізкая вытворчасць працы. З якасцю выпускаемай прадукцыі справа абстаіць таксама не благапалучна. Шмат сродкаў укладзена ў капітальныя затраты, а эфектыўнасці ад гэтых затрат яшчэ не бачна. На заводзе абсталёван мэблёвы цэх. Яшчэ ў красавіку цэх прыступіў да выпрацоўкі крэслаў у колькасці 3500 штук. Выкананне гэтага задання было распачата крайне неарганізавана. Дэталі загатоўляліся без праверкі. У выніку сярод загатоўленных дэталей аказалася многа браку. Зборка крэслаў праводзіцца марудна. У дзень збіраецца толькі 40 крэслаў. Якасць крэслаў нізкая, а коштоўнасць высокая (27 руб. крэсла).

Прастой у зімовы час, за адсутнасцю лесаматэрыялаў, нічому не навучылі кіраўніцтва арцелі. Загатоўка лесу і зараз правалена. Лесаматэрыял можна было даставіць на завод вадой, аднак сплаўны сезон упушчан і зараз лес вялікімі партыямі знаходзіцца ў розных месцах на мелях. Неўзабаве лесазавод зноў будзе стаяць без работы.

30 чэрвеня партыйная арганізацыя ўрэшце занялася справамі завода. На партсходзе быў пастаўлен даклад старшыні праўлення арцелі т. Зверава аб рабоце лесазавода. Комуністы Садкевіч, Горны, Іваноў і др. па 2 разы выступалі па дакладу, кожны гаварыў аб непарадках на заводзе. Здавалася-б, што зараз партарганізацыя дасць рад канкрэтных указанняў, як арганізаваць работу завода, каб ён стаў працаваць як падабае совецкаму прадпрыемству. Аднак гэтага не паследвала. Нагаварыўшыся ўдосталь, комуністы разышліся са схода, не прыняўшы адпаведнага рашэння.

Калі нарэшце справы дайшлі да таго, што завод апынуўся ў надзвычайна крытычным становішчы, было заменена кіраўніцтва завода. Ясная справа, што такая сістэма нічога агульнага не мае з большэвіцкім стылем кіраўніцтва.

XVIII з'езд КП(б)Б абавязаў партыйныя і совецкія арганізацыі палепшыць кіраўніцтва прамысловай кааперацыі, комуністы-ж пярвічнай арганізацыі арцелі „Чырвоная Зорка" гэтых указанняў не выконваюць.

Партыйная арганізацыя абавязана пільна сачыць за работай прадпрыемства, умець своечасова аказаць дапамогу комуністам, працуючым на прадпрыемствах. Ускрываць асноўныя перашкоды ў рабоце і сваімі ўказаннямі накіроўваць работу прадпрыемства на выкананне вытворчых планаў, на выпрацоўку танней высокаякаснай прадукцыі. Вядомая справа, у даным выпадку партарганізацыя пляцецца ў хвасце, непрадумана займаецца справай кіраўніцтва, работай прадпрыемства. **Рожанец.**

Гарадскі сход комсамольскага актыва

Два дні адбываўся сход брэсцкага гарадскога комсамольскага актыва. На ім было абмеркавана рашэнне XI пленума ЦК ВЛКСМ. Даклад аб перабудове работы гарадской комсамольскай арганізацыі ў сувязі з рашэннямі пленума зрабіў сакратар гаркома ЛКСМБ тав. Арцем'яў.

У спрэчках па дакладу выступіла 20 чалавек. Усе яны падвергалі рэзкай крытыцы работу гаркома і пярвічных арганізацый па маруднасць у перабудове сваёй работы. Гарком наогул зрабіў толькі невялікую частку работы—скараціў свой апарат. Але вельмі мала зроблена па арганізацыі розных сталых і часовых камісій, якія па сутнасці не толькі не прыступілі да работы, а ў некаторыя яшчэ не падабраны члены.

Выступіўшыя комсамольцы расказалі, як гарком фармальна, па-канцылярску падышоў да стварэння камісій. Сакратар пярвічнай арганізацыі аблвыканкома тав. Радкевіч прывёў такі факт, калі ў камісію па праверцы ўплаты членскіх узносаў была ўведзена комсамолка Мгавецкая, якая сама больш трох месяцаў не плаціла членскіх узносаў.

Слаба ўцягваюцца ў актыўную грамадзкую работу маладыя, уноўю прынятыя комсамольцы. Там сям існуе такая думка, што яны яшчэ маладыя і не справяцца з работай. Няхай, маў, паходзяць, павучацца „ў нас, старычкоў".

Комсамольцы указалі работнікам гаркома на тое, што большую частку сваёй работы яны павінны перанесці на вечарнія часы. Часам тэлефонны апарат яшчэ раздаюцца тэлефонныя званкі і які-небудзь работнік гаркома выклікае асобных комсамольцаў да сябе ў рабочы час, што ідзе супярэчыць рашэнням XI пленума ЦК ВЛКСМ і можа выклікаць парушэнне Указа Вярхоўнага Совета СССР аб умацаванні працоўнай дысцыпліны.

На актыве многа прыводзілася фактаў запушчанасці ўнутрысаюзнай работы. Сходы ў пярвічных комсамольскіх арганізацыях застарэлую праходзяць сумна, без актыўнага ўдзелу комсамольцаў, не ставяцца на іх пытанні, хвалюючыя моладзь. Як правіла, яны пачынаюцца з вялікім спазненнем. Дарэчы, чаго варта такі факт, калі на апошняе пасяджэнне гаркома два члены бюро тт. Брысенка і Брайнін спазніліся на 50 мінут, а сход актыва ў першы дзень пачаў работу са спазненнем на 40 мінут.

Многа гаварылі на сходзе аб тым, што комсамольскія арганізацыі мала ўдзельнічаюць у гаспадарчым жыцці, не надаюць патрэбнай увагі пытанню павышэння працоўнай дысцыпліны там, дзе яны працуюць альбо вучацца. Меліся выпадкі, калі некалькі комсамольцаў прадсталі перад судом, як парушальнікі працоўнай дысцыпліны. Аднак гэта не стала сігналам для комсамольскіх арганізацый і вакол гэтых учынкаў не была ўзнята грамадская думка.

З нездаваленнем сустрэў актыў выступленне комсамольца, начальніка чыгуначнага тэхнікума тав. Бачкавога, які замест таго, каб быць самакрытычным, усю віну за дрэнную работу комсамольскай арганізацыі тэхнікума, у якой наглядаюцца асобныя выпадкі п'янства, недысцыплінаванасці і інш., узваліў на гарком ЛКСМБ. Не толькі тав. Бачкавой, але і некаторыя іншыя выступаўшыя (Савінкоў—чыгуначная стралковая ахова) імкнуліся ўсімі сіламі сваю бяздзейнасць зваліць на гарком. Ясрава, што яны яшчэ добра не зразумелі рашэнняў XI пленума ЦК ВЛКСМ.

Цікавым было выступленне сакратара пярвічнай арганізацыі ўпраўлення сувязі тав. Смірнова і маладой комсамолкі тав. Крываш з арганізацыі паравознага дэпо. Тав. Смірноў падзяліўся вопытам перабудовы работы комсамольскай арганізацыі у адпаведнасці з рашэннямі пленума. Значна палепшылася тут дысцыпліна комсамольцаў. Сходы праходзяць цікава і пачынаюцца без спазнення. Кожны комсамолец мае нагрузку і добра яе выконвае. Арганізаваны фізкультурная і абаронная работа сярод дапрызыўнікаў, аказваецца дапамога вывучаючым „Кароткі курс гісторыі ВКП(б)". Партыйная арганізацыя аказвае вялікую дапамогу. На усіх сходах прысутнічаюць комуністы, сакратар партарганізацыі тав. Стацура дапамагае падрыхтоўваць сходы, цікавіцца ўсёй работай комсамольскай арганізацыі.

Таварыш Крываш расказала аб сваёй рабоце піонерважатай. Гэту работу яна ўзяла па сваёй ініцыятыве. Астатнія комсамольцы, замацаваныя на работу ў школе, нават не паказваюцца там. Тав. Крываш ніхто дапамогі не аказвае.

У прынятай рэзалюцыі сход комсамольскага актыва горада намеціў рад канкрэтных мерапрыемстваў па перабудове і наладжванню работы гаркома і пярвічных комсамольскіх арганізацый, у адпаведнасці з рашэннямі XI пленума ЦК ВЛКСМ.

М. Зонтэйн.

Без маркіроўкі

Выпуск нядобраякаснай прадукцыі наносіць вялікую шкоду народнай гаспадарцы краіны. Рабіць брак — гэта значыць зрабіць вялікае злачынства перад сваёй дзяржавай, перад народам. Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб адказнасці за выпуск нядобраякаснай прадукцыі прадугледжвае далейшы ўздым нашай народнай гаспадаркі. Барацьба за добраякасную прадукцыю, супроць бракаробаў — абавязак кожнага кіраўніка і рабочага нашых совецкіх прадпрыемстваў. Вінаўнікі браку павінны панесці суровую адказнасць перад совецкім судом, перад усім народам.

Трэба сказаць, што некаторыя прадпрыемствы горада, не гледзячы на Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, груба яго парушаюць, безадказна і злачынна адносяцца да выпуску добраякаснай прадукцыі. Асабліва гэта адчуваецца ў Брэсцкім хлебакамбінаце, дзе дырэктарам тав. Буглак.

15 ліпеня дзяржаўная гандлёвая інспекцыя зрабіла праверку хлебных магазінаў і пякарань Брэста. У магазіне нумар 6 (загадчык тав. Вайнштэйн) у гэты дзень знаходзіліся 28 булкі нядобраякаснага хлеба. У магазіне № 3 (загадчык тав. Розенгартэн) знаходзілася 200 кілаграмаў хлеба непрыгоднага для продажу. Падобнае становішча і ў радзе іншых магазінаў.

Нас зацікавіла, хто выпускае такі хлеб. Было выяўлена, што гэты хлеб выпякаўся ў пякарні № 2, дзе загадчыкам Шынко. У экспедыторскай знаходзілася ў гэты дзень 572 кілаграмы гарэлага непрыгоднага хлеба, які загадчык накіроўваў у гандлёвую сетку. Нялепш і ў пякарні № 6 (загадчык Забанаў). У момант праверкі тут аказалася 105 булак хлеба дрэннай якасці, без маркіроўкі, не вытрымліваючых стандарта. Адсутнасць маркіроўкі давала магчымасць бракаробам рабіць сваю агідную справу, скрываючыся ад адказнасці, пры такой абязлічцы.

Матэрыял аб злосных бракаробах накіраван у гарадскую пракуратуру.

Шчыгельскі,
упаўнаважаны дзяржаўнагандлёвай інспекцыі па Брэсцкай вобласці.

САМАСНАБЖЭНЦЫ

Гандлёвыя работнікі Дамачэўскага раёна не выконваюць указанні партыі і ўрада і груба парушаюць прынцыпы совецкага гандлю. Замест таго, каб праявіць клопаты аб шырокіх масах працоўных спажыўцоў па абслугоўванню іх добрымі абедамі, у Дамачэве сталовую № 1 ператварылі ў зачынены размеркавацель. Тут растранжыриваюць па запісках цукар, муку, сала і іншыя прадукты.

Запіскі паступаюць ад розных асоб, але аднаго і таго-ж характару:

„Загадчыку сталовай № 1. Прашу выдаць цукру для грамадзянкі Гомерштэйн Хаі. Запіску знішчайце". Подпіс неразборчывы. „Прашу выдаць два кілаграма цукру для жонкі Наймана".

Начальнік міліцыі таварыш Кугняцоў прыслаў запіску. „Адпусціце мяса 2 кілаграмы, сала 3 кілаграмы, мукі 3 кілаграмы, цукру 2 кілаграмы".

„Кладаўшчыку сталовай № 1. Адпусціце 10 кілаграм цукру за наяўны разлік. Падпісана: Нікалаюк".

Такіх запісак налічваецца 42. Многія з іх падпісаны былым старшынёй райспажыўсаюза Нікалаюком Кірылам.

Сталовая знаходзіцца ў антысанітарным становішчы. Усюды пыл, бруд. Прадукты не прыкрываюцца ад мух, на сталах няма кляёнак, на падлозе валяюцца акуркі, смецце, кавалкі хлеба. На кухні рыба і мяса накладваюцца на талеркі брудныміі рукамі. Цэны на ўсе другія блюды аднолькавыя—2 рублі 30 кап.

У сталовай № 2 парушаюць цэны на хлеб. Так 7913 кілаграм 85-капеечнага хлеба прадана па 1 руб. за кілаграм. У сталовай адсутнічае ўчот прыхода і расходу паступаючых прадуктаў, што дае магчымасць раскрадваць іх.

Хто-ж такі Найман? Гэта былы спекулянт, які меў раней гасцініцу.

Райспажыўсаюз і загадчык гандлёвым аддзелам РВК не толькі не рэагуюць на факты парушэння прынцыпа совецкага гандлю, але садзейнічаюць самі гэтаму. Пракурор Дамачэўскага раёна таварыш Зуеў ведае пра ўсе гэтыя факты. Спадзяемся, што вінаўнікі атрымаюць па заслузе і што справа совецкага гандлю ў раёне будзе выпраўлена.

П. Берыцаў.

ГІСТАРЫЧНЫЯ РАШЭННІ

Ранішняе пасяджэнне літоўскага сейма 22 ліпеня 1940 г.

КАУНАС, 22 ліпеня (ТАСС). Сёнешняе ранішняе пасяджэнне сейма праходзіла з велізарным уздымам і аднадушшам. Дэпутаты ўсхвалявана вітаюць друг друга з устанаўленнем совецкай улады ў Літве і прымаюць вітанні ад выбаршчыкаў, з'явіўшыхся ў сейм.

Сейм віталі дэлегацыі: інтэлігенцыі Літвы, працоўнай моладзі і літоўскай народнай арміі.

Ад імені Каўнаскага гарнізона выступіў радавы Бармашічус.

Дэпутаты сейма бурнымі апладысментамі адказваюць на прывітанні дэлегацыі.

Па прапанове віцэ - старшыні сейма Гедвіласа пасылаюцца прывітальныя тэлеграмы латвійскаму сейму і дзяржаўнай думе Эстоніі, прыняўшым гістарычныя рашэнні аб устанаўленні совецкай улады ў Латвіі і Эстоніі. З дакладам па зямельнаму пытанню выступіў дэпутат Панявежскай выбарчай акругі Міцкіс.

Дэпутат Міцкіс падрабязна гаворыць аб тым, як вякамі літоўскае сялянства змагалася за зямлю. Ён гаворыць аб шматлікіх сялянскіх паўстаннях і рэвалюцыйнай барацьбе сялян у 1905 — 1917 гадах.

Дакладчык расказвае аб гіганцкіх поспехах соцыялістычнай сельскай гаспадаркі ў СССР.

Дэпутат Міцкіс падкрэслівае, што адзіным гаспадаром усей зямлі ў Літве з'яўляюцца літоўскія працоўныя. На вызваленай зямлі павінны і будуць работаць вызваленыя сяляне. Ён прапануе неадкладна аб'явіць зямлі, лясы і воды ўласнасцю ўсяго народа і дзяржаўнай уласнасцю. Зямля павінна належыць дзяржаве, якая прадставіць зямлю сялянам на вечнае карыстанне.

Дакладчык прапануе зняць з сялянства ўсе выкупныя плацяжы звязаныя з ранейшай зямельнай рэформай, аблягчыць іншыя даўгі, пераглядзець падаткі. Сейм бурнымі апладысментамі выражае згоду з дакладчыкам.

У спрэчках па дакладу дэпутата Міцкіса выступілі дэпутаты сяляне. Выконваючы наказ сваіх выбаршчыкаў, яны гаварылі, што прапанова Міцкіса выражае самыя затоеныя мары і надзеі працоўнага сялянства Літвы.

Дэпутат-сялянін Дамбраўскас заявіў, што сяляне даручылі яму перадаць Народнаму сейму патрабаванне — адабраць зямлю ад памешчыкаў і спекулянтаў і перадаць яе працоўнаму сялянству Літвы.

Былы батрак, зараз валасны старшыня, дэпутат Алішаўскас расказаў сейму, як здзяваліся сметонаўскія чыноўнікі над сялянамі. Гэта быў хвалюючы расказ аб пакутах і цяжкім жыцці працоўных сялян Літвы. Здавалася, што дэпутат Алішаўскас прыводзіць факты з далёкай краіны. Між тым ён гаварыў аб учарашнім дні Літвы.

Аб жаданні працоўнага сялянства зрабіць зямлю ўсенароднай уласнасцю гаварылі і іншыя сялянскія дэпутаты. Хвалюючую прамову сказаў сялянскі дэпутат Віленскай выбарчай акругі Пашкевіч.

— 20 год мы таталіся за панскім кардонам, цяпер працягваем вам брацкую руку. У Віленшчыне зямельны голад быў яшчэ больш востры, чым у іншых частках Літвы. Польскія паны раздавалі лепшыя землі катам на манер генерала Жэлігоўскага, які захапіў Вільна і іншым шляхтычам. Калі сметоноўцы з'явіліся ў Вільна, яны аказаліся не лепш польскіх паноў. На шчасце нас вызваліла ад праклятай панскай сметонаўскай своры Чырвоная Армія. Таму ўсе мы гаворым: „Няхай жывуць кіраўнікі Совецкага Саюза на чале з таварышом Сталіным". „Пад Сталінскай Канстытуцыяй мы пойдзем да лепшага жыцця".

Дэпутаты сейма і госці сустракаюць заключныя словы Пашкевіча бурнымі апладысментамі.

У кароткім заключным слове дэпутат Міцкіс адказвае на некаторыя высунутыя дэпутатамі пажаданні. Затым агалашае дэкларацыю аб зямлі. Дэкларацыя прымаецца аднадушна. Зала вітае яе бурнымі апладысментамі.

Зямлю працоўнаму народу

Пасяджэнне латвійскага сейма 22 ліпеня 1940 года

РЫГА, 22 ліпеня (ТАСС). Роўна ў 12 гадзін старшыня сесіі дэпутат Брэдзіт адкрыў чарговае пасяджэнне. У парадку дня пытанне аб зямлі.

Дэпутату Ванагу, дакладчыку па зямельнаму пытанню, апладыравала ўся краіна. У яркім, насычаным шматлікімі фактамі дакладзе, ёсць ясная праграма вырашэння зямельнага пытання. Зямля становіцца ўсенародным адабыткам і пераходзіць ва ўласнасць дзяржавы. Беззямельныя і малазямельныя сяляне атрымаюць зямлю з дзяржаўных фондаў да 30 га на кожную гаспадарку.

Урад і народ аб'яўляюць рашучую барацьбу драпежніцкай эксплаатацыі зямлі і выкарыстанню яе ў інтарэсах нажывы.

Бурнымі апладысментамі сустрэлі дэпутаты гэтую заяву дакладчыка, выразіўшага векавыя надзеі працоўнага сялянства.

З вялікай увагай заслухаў сейм прамову дэпутата Бергача, які гаварыў аб надзвычайна цяжкім становішчы латгальскіх сялян, аб той радасці, якую перажывае працоўнае сялянства Латгаліі ў гэтыя гістарычныя дні вызвалення латвійскага народа ад гнёту памешчыкаў і капіталістаў.

Дэкларацыя аб зямлі прынята сеймам з вялізарным уздымам. Дэпутаты стоячы выслухалі тэкст дэкларацыі, аднадушна галасавалі за яе зацвярджэнне.

Дзесяткі прывітальных тэлеграм шле народ свайму сейму, выражаючы глыбокую радасць і задавальненне ў сувязі з аб'яўленнем Латвіі Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай і ўваходжаннем Латвіі ў брацкую сям'ю народаў вялікага Совецкага Саюза.

Урачыстасць у Совецкай Літве

КАУНАС, 22 ліпеня, (ТАСС). Учора вечарам, калі стала вядома, што Народны сейм аб'явіў Літву Літоўскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай і перадаў усю ўладу ў рукі Совецкіх дэпутатаў працоўных, у Каўнасе, Вільна, Шаўляй і іншых гарадах і мястэчках адбыліся шматлікія мітынгі працоўных. На мітынгах працоўныя горача віталі рашэнне сейма. На мітынгу ў Вільна ўдзельнічала 100 тысяч чалавек.

Сто тысяч чалавек усхвалявана віталі рэзалюцыю, адабраючую ўступленне Літвы ў склад Совецкага Саюза.

Двухсоттысячная дэманстрацыя ў Рызе

РЫГА, 21 ліпеня (ТАСС). З 6 гадзін вечара на вуліцах і бульварах сабраліся натоўпы працоўных у чаканні сканчэння пасяджэння сейма. Не паспелі змоўкнуць авацыі ў зале пасяджэння сейма, які абвясціў совецкую ўладу ў Латвіі, як бурная радасць ахапіла сабраўшыхся. Дэманстранты са сцягамі і партрэтамі правадыроў СССР і лозунгамі, вітаючымі совецкую ўладу, запоўнілі вуліцы сталіцы. Калона за калонай дэманстранты праходзілі каля трыбуны, дзе знаходзіліся дэпутаты сейма і ўзбуджаная авацыяй віталі сваіх выбраннікаў.

У дэманстрацыі ўдзельнічала 200 тысяч чалавек працоўных.

Мітынг працоўных Таліна

ТАЛІН, 21 ліпеня (ТАСС). Вечарам на стадыёне адбыўся многалюдны мітынг працоўных Таліна, прысвечаны адкрыццю Дзяржаўнай думы. Выступіўшыя на мітынгу дэпутаты Дзяржаўнай думы Кадакас, доктар Хіоні Янус былі горача сустрэты працоўнымі.

Дэпутат Янус заявіў: „З сёнешняга дня у Эстоніі устанаўліваецца новая дзяржаўная ўлада, улада Совецтаў". Сваю прамову Янус заканчвае словамі:

— Няхай жыве Эстонская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка, саюзная рэспубліка вялікага Совецкага Саюза!

ХРОНІКА

Соўнарком Саюза ССР назначыў тав. Фіорова В. А. намеснікам Народнага Камісара Каляровай металургіі.

Соўнарком Саюза ССР назначыў тав. Крапіцына Б. Т. намеснікам Начальніка Галоўнага Упраўлення Паўночнага Марскога шляху пры Соўнаркоме Саюза ССР.

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

ЛОНДАН, 22 ліпеня (ТАСС). У паведамленні міністэрства ўнутраных спраў і ўнутранай бяспасанасці гаворыцца, што ў ноч на 22 ліпеня германскія самалёты скінулі бомбы ў адным з раёнаў Цэнтральнай Англіі, а таксама бліска ад паўночна - ўсходняга ўзбярэжжа.

22 ліпеня 80 германскіх самалётаў зрабілі напад на гандлёвыя судны ў Ла-Маншы. Збіт германскі самалёт, некалькі іншых агрымалі пашкоджанні.

Паблізу паўднёва - ўсходняга ўзбярэжжа адбыўся рад паветраных баёў. Збіт германскі самалёт.

У камюніке міністэрства авіяцыі гаворыцца, што 21 ліпеня ў паветраных баях ля англійскага ўзбярэжжа апрача 12 самалётаў, аб якіх паведамлялася, збіта 9 непрыяцельскіх самалётаў.

Зводка вярхоўнага камандвання германскай арміі

БЕРЛІН, 22 ліпеня (ТАСС). У зводцы вярхоўнага камандвання гаворыцца, што германскія самалёты зрабілі налёт на аэрадромы, бензінасховішчы і прадпрыемствы Англіі. Адзначаны ўзрывы і буйныя пажары. На Ла-Маншы патоплен танкер і 4 гандлёвых судны.

Варожыя самалёты ў ноч на 22 ліпеня зрабілі налёт на паўночна-заходнюю частку Германіі і акупіраваныя Германіяй вобласці. Нанесены некаторыя матэрыяльныя страты. Збіта два самалёты праціўніка. Праціўнік страціў учора 8 самалётаў. 4 германскіх самалёты не вярнуліся на базу.

Зводка італьянскага камандвання

РЫМ, 22 ліпеня (ТАСС). У зводцы італьянскага камандвання паведамляецца, што ў выніку паветрана-марскіх баёў апрача англійскага авіяносца „Арк Роял" і лінейнага крэйсера „Худ" моцна пашкоджаны лінкор і два крэйсеры. Збіт непрыяцельскі самалёт.

Ва Ўсходняй Афрыцы бамбардыраваны базы Буна і Ваджыр (Кенія). Адзін непрыяцельскі самалёт збіт. Усе нашы самалёты вярнуліся на базы.

Ваенныя дзеянні ў Афрыцы

ЛОНДАН, 22 ліпеня (ТАСС). У камюніке англійскага камандвання гаворыцца, што за апошнія дні мінулага тыдня налётамі нашай авіяцыі на аэрадромы ў Тобруку і Эль-Губі (Лівія) нанесены значныя пашкоджанні. У Эль-Губі ўзніклі тры пажары, адзін быў бачны на адлегласці 60 кілометраў. У Тобруку пашкоджаны караблі і мол. Англійская авіяцыя паспяхова бамбардыравала ваенныя аб'екты Бардзіа. Варожая авіяцыя зрабіла налёты на егіпецкія пункты Сідзі-Барані, Эс-Салум Мерса-Матрук і Фака, прычыніўшы нязначныя пашкоджанні. Злучэнні італьянскіх бамбардыроўшчыкаў пад прыкрыццём вялікай колькасці знішчальнікаў зрабілі два налёты на Мальту. Два італьянскіх самалёты збіты.

Адкрыццё Панамерыканскай канферэнцыі

НЬЮ-ЙОРК, 22 ліпеня (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Асошыейтэд Прэс, у Гаване адкрылася канферэнцыя міністраў замежных спраў амерыканскіх краін. Адкрываючы канферэнцыю, прэзідэнт Кубы Ларэдо Бру заявіў, што заходняе паўшар'е ўступае ў новае жыццё, поўнае трывогі. „Амерыканскія рэспублікі, — заявіў Ларэдо Бру, — павінны падрыхтавацца да абароны агульных інтарэсаў". Ларэдо Бру пазбягаў канкрэтных прапаноў.

Амерыканскі друк указвае, што многія дэлегаты вельмі песімістычна расцэньваюць перспектывы канферэнцыі з прычыны рознагалоссяў, існуючых паміж паасобнымі дэлегацыямі.

Коноэ сфарміраваў новы кабінет

ТОКІО, 22 ліпеня (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Домей Цусін, прэм'ер Коноэ закончыў фарміраванне кабінета. У кабінет увайшлі: прэм'ер-прынц Коноэ, міністр замежных спраў і адначасова калоній — Мацуока Іосуке, міністр унутраных спраў і адначасова аховы здароўя—Ясуі Эйдзі, міністр фінансаў — Кавада Ісао, ваенны міністр — генерал-лейтэнант Тодзіо Эйкі, марскі міністр — віцэ-адмірал Іосіда Дзэнго і другія.

Адказны рэдактар Т. Г. Мычкуноў.

Адрас рэдакцыі: вуліца імені Карла Маркса 23. Тэлефоны 1—17, 1—20, 2—10. Друкарня ім. Варашылава Аблыт 195